Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Пераменa адрасу 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не зварачаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Субота 18-га жніўня 1928 г. — Год 1

Красавіца Вільня.

Вядомая легенда апавядае аб тым, як Гэдыміну падчас яго паляваньня на цяперашніх Панарскіх горах, што акружаюць Вільню, прысьніўся жалезны воўк, які напрарочыў яму аб важнасьці месца, на якім ён спаў. Нібыта гэта сталася прычынай заснаваньня Вільні. Так яно, ці інакш (навейшыя досьледы кажуць аб існаваньні да таго часу невялічкай вёскі, якую Гэдымін перарабіў у сталіцу), але выбар месца пад сталіцу паляўнічым — князям, які знаўся пэўна-ж на красе прыроды, — быў удачны. Хто прыяжджае ў Вільню, ня можа ня бачыць яго прыгожых ваколіцаў, і то — з усіх бакоў Вільня — красавіца, якая захавала сваю прынаду ад сярэдніх вякоў. Вільня і ўнутры вабіць прыежджых сваею сераднявечнаю красою.

І вось у нашы, пэўна-ж, новыя часы за гэту красавіцу гатовы біцца два рыцары: з аднаго боку раскаханы ў ей марш. Пілсудскі, з другога заварожаны Вальдэмарас. На ваччу ўва ўсіх—іх апошнія палкія прызнаньні ў каханьні красавіцы Вільні з цьвёрдаю рашучасьцю з боку кожнага валадаць ею.

Ясна, што ані Пілсудскі, ані Вальдэмарас не выражаюць толькі сваей думкі. За плячыма аднаго стаіць мілітарыстычная (ваяўнічая) Польшча, за плячыма другога — фашыстаўская Літва. На палкім прызнаньні абодвух сыйшліся два маладых імпэрыялізмы.

Маладая Польская дзяржава імкнецца да „моцарствовага“ становішча ў Эўропе і ўся яе экспанзыя натуральна кіруецца ў бок слабейшага супраціву, г. ё. на ўсход, дзе, па словах шавіністаў, Польшча мерыцца ня лікам польскага насяленьня, а лікам дзесянцін зямлі. Гэта значыць, што гэтыя землі, якія насяляе і абрабляе беларускі (а таксама ўкраінскі і літоўскі) селянін, амаль у большасьці знаходзяцца ў руках польскіх... абшарнікаў (цяпер у Зах. Беларусі і Украіне да іх прылучыліся яшчэ асаднікі) За часу панаваньня Аляксандра I і з яго дазволу землі калішняга Літоўскага князьства былі галоўным вогнішчам польскай арыстакратычнай культуры. Тут радзіліся, узгадаваліся і пакрылі сябе славай найвялікшыя польскія поэты романтызму — Адам Міцкевіч, Юліуш Славацкі, далей Сыракомля, Крашэўскі, Арэшка і інш. З гэтым краем зьвязаны найгалаўнейшыя паўстаньні польскага абшарніцтва проці маскоўскага царызму. Гэтыя „крэсы“ для Польшчы з яе вядомымі лёзунгамі „od morza i do morza“ і „będzie Polska do Tobolska“ — вяжуць і яскравыя традыцыі (ўспаміны, паданьні) мінуласьці і кроўны інтарэс яе (польскага) абшарніцтва, захаваць усе свае „дзесянціны“. У цэнтры гэтых і романтычна - традыцыйных і эканамічна-палітычных імкненьняў польскага імпэрыялізму ляжыць без сумляваньня Вільня, як натуральны цэнтр усяго беларуска-літоўскага краю, да таго яшчэ за доўгія вякі панаваньня спалянізаваны. Такім чынам нядаўнія прызнаньні ў каханьні маюць рэальныя падставы ў польскім „Drang nach Osten“ (руху на Усход), а іх палкасьць—у кроўнай эканамічнай зацікаўленасьці польскага абшарніцтва. (Мусім сказаць, што польская буржуазія тут знаходзіцца ў эмбрыёне, зародку, але й яна „хоча рынкаў збыту“).

Прычыны прызнаньня Вальдэмараса маюць характар яшчэ больш романтычны, бо бяз кроўнай эканамічнай зацікаўленасьці, але, тым няменш — не слабей палкія. Трэба зразумець псыхіку (душэўныя настроі) літоўскіх нацыяналістаў. Ніякі літоўскі патрыёт ня можа сабе ўявіць самога існаваньня Літвы, як дзяржавы, бяз Вільні, як сталіцы. Вільня была доўгі час сталіцай гістарычнай Літвы, усе іншыя сталіцы — даўнейшыя літоўскія, Крэва, Навагрудак, Трокі—цяпер і недасяжныя для Літоўцаў і пэўна-ж, як сталіцы, „абражалі-б іх нацыянальную гордасьць“. Усё г. зв. літоўскае нацыянальнае адраджэньне, ад самага яго пачатку і аж да апошняга часу, вырасла на сталай, бескампрамісовай думцы, што незалежная Літва мысьлілася толькі са сталіцай Вільняй. Іншае думкі ніхто з літоўскіх адраджэнцаў ніколі і не прыпушчаў. Навет гісторыя, якая адбывалася на нашых вачох, сьведчыць аб проста зайздросна—хвараблівым імкненьні літоўскай буржуазіі да валаданьня Вільняй. Такія-ж самыя прэтэнзіі беларускіх нацыяналістаў з указаньнем, ня толькі роўных гістарычных правоў, а таксама і тога факту, што насяленьне блізка да сотні вёрст кругом Вільні прыводзілі літоўскіх нацыяналістаў да шаленства і, як кажуць, былі галоўнай прычынай сапхненьня „Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі“, з цёплых хлябоў у Коўне. Палякоў літоўскія нацыяналісты слушна лічаць прыбышамі, якім адмаўляюць права голасу ў пытаньні аб Вільні.

Думка аб страце Вільні для кожнага літоўскага нацыяналіста, ці ён правы, ці „левы“ — роўназначна блізка са стратай самай незалежнасьці Літвы. Думкаю аб Вільні напоена ўся Літва: маладая буржуазія, жадаючая мець большы цэнтр; аперачая бюракратыя, зайздросная мець лепшыя палацы; духавенства, прагнучае мець у руках выпрабаваныя „сьвятыні“ для удзяржаньня даўжэй улады над селянінам; інтэлігенцыя з сваім гістарычным дурманам, нарэшце напоенае ксяндзамі сялянства. Вільня для нацыяналістычна-настроенага літоўца сталася, як кажуць — ідэяй—фіксам. Нядарма усе літоўскія партыі і ўрады ў спорцы з праціўнікамі апіраюцца, як на галоўны довад, на лепшае ўменьне адстаіваць патрэбу адабраньня Вільні. Пэўна-ж гэты аргумэнт (довад) ёсьць галоўным і цяперашняму дыктатару Вальдэмарасу, які стала поіць думку аб адабраньні Вільні і ўключыў гэта навет у новую фашыстаўскую канстытуцыю; аргумэнт, каб удзяржацца больш каля ўлады і душыць усялякі вольны рух у краі.

Вось, дзе прычына палкіх прызнаньняў з аднаго і з другога боку, вось дзе прычына бою за красавіцу Вільню!

Чым кончыцца гэты бой? А кончыцца ён мог-бы і то... вельмі сумна для Літвы. Бязумоўна, такая карлікавая дзяржаўка, як Літва, не магла-б устаяць перад польскім „Drang nach Osten“ і зноў які небудзь Жэлігоўскі лёгка зрабіў-бы яшчэ адзін марш на... Коўну, за якой настала-б „фэдэрацыя“ ў мысьль пэўна-ж абшарніцкага „Słowa“ і былі-б, як „вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі“, якраз як мы цяпер, прыкладам з панамі. Цэлы спор быў-бы зьліквідаваны. Але... маленькае але... міжнароднае палажэньне!

Ужо неяк сталася агульна прызнаным цьверджаньне, што вайна ў Эўропе можа быць толькі агульна-эўрапэйскай, калі не агульна сусьветнай. Інтарэсы ўсіх так перапляліся, што маленькая зачэпка ў нязначным месцы, як гэта было ў басьнійскім Сараеве ў 1914 г. — можа стацца прычынай вялікага сусьветнага выбуху. Тады, пры такіх абставінах, справа Вільні становіцца вялікай міжнароднай праблемай сусьветнага значэньня.

Буржуазныя дырыжоры Эўропы ўжо колькі часу, чуць не ад Вэрсальскага міру, клапоцяцца аб ліквідацыі спору за Вільню. Высоўваліся розныя праекты (Вільня — сталіца „Сярэдняе Літвы, Вільня — вольнае места і г. д.), але вырашэньне спору стаіць і да цяпер на мёртвым пункце. А якраз цяпер, як цьвердзіць савецкая прэса, буржуазным заправілам Эўропы найбольш важна памірыць абедзьве дзяржавы, бо спор перашкаджае ім у задуманым нападзе на СССР.

Спор мае нібы аканчальна вырашыцца на асеньняй сэсіі Ліга Нацыяў. Аднак, можам сьмела цьвердзіць, што якое-б ня было вырашэньне Лігі, яно не зьліквідуе спору аб Вільні, як таксама і варожасьці Літвы да Польшчы і на адварот. Вальдэмарас добра цяміць, што да вайны ня можа дайсьці, бо за яе, баючыся небясьпекі палучэньня ўсіх капіталістычных дзяржаваў у адну кампанію, стаіць магутны СССР і зьвязаная з ім Нямеччына. А трэба дадаць, што вайна з СССР азначае без сумляваньня — дамовую вайну ў тых дзяржавах, якія выступаюць проці яго, натуральную вайну працоўных проці сваіх-жа камандзіраў, якія задумаюць вясьці іх проці СССР.

Такім чынам красавіца Вільня з яе чароўнымі і прынаднымі ваколіцамі так і астаецца, без жаніха і рыцары будуць яшчэ пяяць ей палкія песьні каханьня, аж пакуль думка аб пэўным самавызначэньні народаў не запануе і ў гэтым куточку Эўропы.

З работніцкіх выпадкаў у Польшчы.

Сярод вялікага ліку прыказак, гэтай вялікай крыніцы народнай мудрасьці, вельмі яскрава і зразумела характарызуючых нам факты жыцьця і навет яго законы, ёсьць і такая прыказка:

„Чалавек пазнаецца ў дробязях“.

І запраўды, хто ўважна прыглядаецца да людзей, хто сачыць за іх жыцьцём, таму даволі толькі трохі пагаварыць з чалавекам, убачыць ня ўсё жыцьцё, а толькі некалькі хвілін яго, што ён у гэты час робіць, што думае, якія яго пагляды на тую ці іншую справу—і ўжо з гэтых дробязяў ён добра ведае, што гэта за чалавек перад ім.

І такое адгадваньне „па малым вялікага“ надта лёгкае і ім займаецца кожны з нас, напрыклад. Калі мы бачым чалавека бедна апранутага, у замазанай, палатанай вопратцы, то не дадаючы да гэтага, што ён яшчэ з худым, апаленым сонцам тварам, з упаўшымі глыбока вачыма, з мазалямі на руках, ужо ведаем, што гэта якісь бедны працоўны чалавек, ведаем гэта, хоць і ня бачым яго пры рабоце, што ён есьць і п'е і што мае.

І наадварот, калі спаткаем чалавека, чыста і багата апранутага, з залатымі пярсьцёнкамі на руках (замест мазалёў!?), то не дадаючы да гэтага, што ён яшчэ і з тлустым, круглым, як галандзкі сыр, тварам, з заплыўшымі салам вачамі дый з тоўстым жыватом,—мы ўжо ведаем, што гэта нешта зусім адваротнае таму бедняку-сярмяжніку. Мы ведаем, што гэта чалавек багаты, не працуючы,—хоць і ня бачым усяго яго багацьця, і як ён за ўсё сваё жыцьцё і пальцам не дакранецца да работы, ведаем, што ён мае ўсё „гатовенькае“, зробленае для яго кімсьці, а іменна,—тым-жа бедняком-сярмяжнікам.

Правільнасьць гэтага вываду падцьвярджае ўвесь многагодні ланцуг людзкога жыцьця, суцэльнасьці, як цэласьць і кожным сваім зьвяном, у аддзельнасьці (як дробязь).

Гэта-ж самае,—што адны людзі жывуць коштам другіх — коштам „мяса“ і жыцьця другіх—падцьвярджаецца стала і на кожным шагу і цяпер, і то навет асабліва цяпер і часта навет такімі „выпадкамі“, што аж жудасна робіцца, бачучы, да чаго дайшоў вызыск чалавека, над чалавекам.

Якраз такі жахлівы (і характарны, рэальны!) „выпадак“ здарыўся нядаўна ў Польшчы—у прадзільнай фабрыцы Пазнанскага ў Лодзі.

Справа ў тым, што дырэкцыя вымененай фабрыкі зьменшыла сваім работнікам і работніцам плату да 4—5 злотых у дзень, што пры цяперашняй даражыні і наагул дрэнных варункаў жыцьця (для бедных працоўных) у вялікім горадзе зьяўляецца прысудам на павольную сьмерць, а асабліва для сямейных работнікаў.

Работнікі і работніцы спраціўіліся, натуральна, такому зьверству і абвясьцілі забастоўку.

І вось, калі пэўнага разу сабраўшыяся на фабрычным двары бастуючыя работнікі і работніцы (з закліку дырэкцыі фабрыкі) адмовіліся ад новых варункаў працы, жадаючы прывернeньня старых, дык адзін з дырэктароў фабрыкі—Гофман, меў столькі „цывільнай адвагі“ і „шляхотнасьці“ сказаць работніцам: калі ня можаце выжыць, дык вазьміце шнур (вяроўку) і павесьцеся, а што тычыцца дзяцей, дык ня выходзьце замуж і не жанецеся, то і дзяцей ня будзеце мець, — а да мяне ня майце прэтэнзіі“. (Polska Wolność № 33).

Работнікі, абражаныя такой „шляхотнасьцю“ да глыбіні душы, не маглі не зарэагаваць на гэта, што ня мог-бы не зрабіць і найхаладнакроўнейшы чалавек, маючы ў грудзёх хоць трохі пачуцьця сваей людзкай годнасьці,—і работнікі пабілі „начальства“—разьбілі головы двом дырэктарам (рэшта „начальства“ ўцякла, хто куды) і разьбілі кантору. З работнікаў-жа, некалькі дзесяткаў чалавек арыштавана (і пэўна яны добра дастануць за „камуністычныя выбрыкі“).

Гэтая, малюсенькая дробязь з пачуцьця дзьвёх галоўных клясаў людзкасьці працоўных і не працуючай — з іх узаемаадносінаў, вельмі яскрава сьведчыць і ілюструе сучаснае становішча гэтых клясаў.

Гэты „выпадак“ сьведчыць, што ўстабілізаваная па вайне буржуазія, чым далей, тым больш „задзірае нос угару“, як кажа наша вёска. Яна стараецца, што-раз, то больш абдзіраць работніка і трактаваць яго, як жывёлу, з якога можа зрабіць усё, што хоча: павялічыць, як ей у „кандуне закруціць“, працу, а зьменшыць пойла, ці іншую трасянку.

І аб тым яшчэ сьведчыць гэтая „дробязь“, што гэтая капіталістычная „жывёла“—работнікі, не такая жывёла на самым дзеле, як іх лічаць капіталісты — бо-ж масавыя і частыя забастоўкі ў Польшчы сьведчаць аб нечым іншым — аб пачуцьці работнікамі сваіх чалавечых праў і аб змаганьні за іх.

Тут само слова „змаганьне“ паказвае, што дзеля змаганьня, патрэбны сілы — адна за, другая—проці

У змаганьні ж працоўных з капіталістамі бачым, што капіталісты—вялікая сіла, бо яны з'арганізаваны ў адну сусьветную арганізацыю—і моцна трымаюць парадак, які завецца капіталізмам.

Дык вось, на гэтую сілу і працоўныя капіталістычных дзяржаваў павінны паставіць ня меншую сілу — работніцкую арганізацыю і толькі арганізавана яны даб'юцца свайго вызваленьня з-пад вызыску фабрыкантаў, а ня арышту колькі дзесяткаў работнікаў, як у Лодзі.

Дык няхай-жа, гэты „выпадак“ у фабрыцы Пазнанскага ў Лодзі працоўныя ўсей Польшчы і наагул, усе працоўныя, стогнучыя пад капіталам, не прапусьцяць „міма вушэй, а хай ён ім паслужыць лёзунгам, да больш пэўнага мэтаду змаганьня, як кулачная расправа з дырэктарамі.

Хай гэта паслужыць да з'арганізаваньня і да салідарнай, а не аддзельнай барацьбы ўсіх працоўных Польшчы з усім капіталістычным ладам, а не з паасобнымі прадстаўнікамі буржуазіі.

Толькі такім мэтадам працоўныя вызваляцца з-пад капіталізму.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Сэрба-харвацкі канфлікт.

Югаслаўскі Сойм мяркуе, ці выдаць суду ці не — паслоў-супольнікаў забойцы Харвацкіх павадыроў.

Камісія Югаслаўскага Сойму пастанавіла на паседжаньні 9 жніўня (аднагалосна) — выдаць суду паслоў Поповіча і Іовановіча, падазраваных у тым, што — поруч з паслом Рачычам — надрыхтавалі забойства харвацкіх паслоў у Сойме 20 чэрвеня. Гэта пастанова камісіі — яўна прынята пад уплывам сьмерці Радзіча і жаданьня з боку сэрбскіх кіруючых колаў залагодзіць настроі ў Харватыі. Бо-ж тольні 8 жніўня напярэдадні гэтай пастановы, — тая-ж камісія пастанавіла — не выдаваць паслоў гэтых суду. Але такі неспадзяваны зварот у камісіі выклікаў страшэнныя спрацівы з боку крайніх, непрымірымых сэрбскіх нацыяналістаў. Дык газэты пішуць, быццам тая ж камісія скасавала ўжо сваю апошнюю пастанову, ізноў адмовіўшы выдаць суду бліжэйшых сяброў забойцы. Так круціцца сэрбская эндэцыя, баючыся аднолькава — і ўсхваляваньня харвацкага народнага мора і сэнсацыйных рэваляцыяй у згіднай справе пляновага падрыхтаваньня забойства.

Нямецкая прэса аб сьмерці Радзіча.

Нямецкая прэса прыдае вялікую вагу сьмерці Радзіча і таму далейшаму расколу, паміж сэрбамі і харватамі, які выкліча гэты факт. Нямецкая прэса слушна бачыць у гэтым расколе, пагражаючым развалам югаслаўскага адзінства, вялізарнай важнасьці факт— ня толькі для агульнай раўнавагі на Балканах; але і для стабілізацыі ўсяго пасьля-ваеннага ладу ў Эўропе.

Балканы і без таго — „парахавы склад" у Эўропе, а тутака ў яго кінута яшчэ лішняя галавешка страшэнна, завастрыўшая ненавісьць харватаў да сэрбаў, уесьцяж правакаванай белградзкім палітычным рэжымам.

Наскольні гэта ненавісьць аслабляе унутраную і вонкавую сілу Югаславіі, акружаную навакол ворагамі — з Італіяй на чале— гэта ясна кожнаму. Дык запраўды-ж Мусоліні мог-бы даць пажыцьцёвую пэнсію забойцам Радзіча, як сваім вярнейшым саюзьнікам.

Сэрбскія „дэмакраты" і „радыкалы" — аб Радзічу.

Павадыр сэрбскіх урадавых „дэмакратаў" пасол Давідовіч — на спэцыяльным паседжаньні свайго клюбу — сказаў прамову, азвяраваную нябошчыку Радзічу.

Аратар — ад імя партыі—выразіў сям'і нябошчыка выразы жалю, „нябошчык Радзіч, казаў ён, здолеў здабыць сабе бясспрэчнае даверве з боку харвацкага народу, а асабліва-ж — яго сялянскай большасьці. Палітычная дзеяльнасьць Радзіча і яго патрыятызм— пяройдуць у гісторыю".

—·—

Не маглі перайсьці да парадку дня над сьмерцяй Радзіча і яго заклятыя ворагі — сэрбскія „радыкалы". Адбылося спэцыяльнае паседжаньне і гэтага клюбу, на якім віцэ-старшыня яго праліў некалькі „кракадылавых сьлёзаў" над трупам забітага сябрам гэтага клюбу харвацкага павадыра.

У знак жалобы спынена ўсялякая праца ў парляманьце. Старшыні ўсіх камісіяў— пасьля прамоваў, прысьвечаных памяці Радзіча, перарвалі паседжаньні.

Аб'яднаньне ў апазіцыйны блёк усіх харвацкіх партыяў

Пасьля выпадкаў у Югаслаўскім Сойме 20 чэрвеня (забіцьцё паслоў) — на бок сялянска-дэмакратычнай апазіцыі перайшлі ўсе, бяз вынятку, харвацкія партыі, стварыўшы такім чынам — адзіны нацыянальны фронт проці сэрбскай гэгэмоніі ў дзяржаве. Дзеля таго — нарада апазіцыі ў Загрэбе — у гмаху былага харвацкага краёвага Сойму (за аўстрыяцкім панаваньнем) запраўды-ж зьявілася як быццам асобным харвацкім Соймам— побач з белградзкім. І як ведама, першым чынам гэтага „Харвацкага Сойму" было выданьне Маніфэсту Дэмакратычна-Сялянскай апазіцыі, які патрэбаваў — грунтоўнай перабудовы Югаславіі на фэдэрацыйных падставах, абвясьціўшы ня важнымі і, ня вяжучымі Харватыю ўсе настановы белградзкага парляманту, зробленыя бяз учасьця паслоў апазіцыі.

Урачыстыя хаўтуры Радзіча ў Загрэбе.

Павадыры дэмакратычнай харвацкай партыі пастанавілі—не дапусьціць да ўчасьця ў хаўтурнай працэсіі за гробам Радзіча— прадстаўнікоў югаслаўскага ўраду і — усіх тых сэрбскіх партыяў, якія — пасьля крывавых падзеяў 20 чэрвеня — не далучыліся да байкоту сучаснага парляманту, абвешчанага харватамі.

Харвацкія павадыры таксама рашуча адмовіліся ад прапазіцыі белградзкага ўраду — прыняць на кошт дзяржавы хаўтуры Радзіча, заявіўшы, што на гэта харваты знойдуць самі грошы ў родным краі.

—·—

Урэшце 12 жніўня адбыліся хаўтуры. У працэсіі прынялі ўчасьце 300 тысяч народу, у тым ліку — 200.000 харвацкіх сялян! Караля рэпрэзэнтаваў ген. Матыс. Урачыстасьці цягнуліся 8 гадзінаў, пачаўшыся ад 10 гадзіны раніцы. Новы старшыня сялянскай харвацкай партыі пасол доктар Мацэк сказаў прамову да сабраўшыхся навакол гмаху Галоўнай Управы партыі масаў народу. Пасьля прамаўлялі — пасол Прыбічэвіч і старшыня магістрату Загрэбу.

Хаўтуры прайшлі наагул спакойна. Як ведама, кіраўніцтва партыі перад хаўтурамі зьвярнулася да народу з адозвай, у якой заклікала харватаў да еднасьці і спакою, каб такім спосабам найлепш ушанаваць памяць нябожчыка.

„Харваты ня стануць на шлях гвалтаў".

Адна з чаловых харвацкіх газэтаў у Загрэбе піша: „Можна быць пэўнымі, што харваты ня пойдуць шляхам гвалтаў. Мы маем іншыя спосабы чыну, чым карабіны ці пісталеты. Радзіч бароўся ўсё сваё жыцьцё, але ня быў рэвалюцыянэрам (?). Ён баяўся праліцьця крыві і прапаведваў мірныя шляхі барацьбы і паразуменьня. Харвацкі народ пойдзе яго сьледам і будзе кіравацца яго навукай. Бо-ж гэта—адзіны спосаб, які найвярней вядзе да перамогі. Толькі барацьбой такога роду харвацкае сялянства, арганізаванае ў партыю, здабудзе сымпатыю ўсяго сьвету і—перамогу".

—·—

Пэўне-ж—сэрбская эндэцыя трыумфавала-б, калі-б яе агэнтам удалося справакаваць харватаў на якое паўстаньне, у якім яны пэўне-ж былі-б пабіты мілітарнай перавагай сэрбаў—пры дапамозе саюзьнікаў...

Тэстамэнт Радзіча.

Адна з газэтаў даносіць. — 9 жніўня расьпячатаны „палітычны тэстамэнт" Радзіча. У тэстамэнце Радзіч быццам назначае сваім наступнікам на становішчы павадыра харвацкай сялянскай партыі доктара Трумбіча (?), харвата, родам з Далматыі, старога парляманцкага дзеяча—яшчэ за аўстрыякамі. У 1917 г. Трумбіч надпісаў—ад імя харватаў— умову з Пашычам, і з харватаў быў першым міністрам заграпічных спраў Югаславіі. Пасол Трумбіч быў павадыром Рэспубліканскай Харвацкай Партыі (?), якая не згадзілася на адмову ад таго лёзунгу „Харвацкай Незалежнай Рэспублікі", які пасьля пакінуў Радзіч з большасьцяй партыі, прызнаўшы манархічны лад Югаславіі і супольную дзяржаўнасьць. Пасол Трумбіч толькі за два тыдні назад далучыўся да агульнага фронту харватаў, калі агульны настрой проці Сэрбіі вельмі завастрыўся і Радзіч канчальна спыніўся на лёзунгу поўнай самастойнасьці Харватыі, толькі фэдаратыўна злучанай з Сэрбіяй.

Назначэньне павадыра левага крыла партыі чаловым камандзірам аб'яднанага харвацкага фронту падчырківае больш рашучае, крайняе становішча Харватыі ў яе споры з Сэрбіяй.

Тэстамэнт Радзіча далей зьмяшчае заклік да харвацкага народу—захаваць поўны спакой, не паддаючыся ніякім правакацыям.

У маніфэсьце да народу павадыры партыі цытуюць тэстамэнт Радзіча, дадаючы, што павадыр забіты для таго, каб пазбавіць харвацкі народ магчымасьці перамогі. Але сам Радзіч у сваей прамове 20 чэрвеня, калі яго папераджалі аб рыхтаваным на яго замаху, сказаў: „Мяне могуць забіць, але майго духу, духу жывучага ў-ва мне народу забіць ня можна". Дух народу, які імкнецца да волі і спыненьня несправядлівасьці, пераможа заўсёды.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Перагаворы з Літвой.

Польская прэса падае, быццам Літва згодзіцца на прапазіцыю польскага ўраду — адбыцьця супольнай канфэрэнцыі ў Жэнэве, якраз перад распачацьцем сэсіі Лігі Народаў.

Ці-ж паможа Польшчы гэтая прыпушчальная згода Літвы на польскую прапанову ў справе іх спору з-за Віленшчыны?!

Аб зьмене канстытуцыі.

Прэса інфармуе, што перад склікацьнем асеньняй сэсіі польскага парляманту ў верасьні адбудзецца цэлы рад паседжаньняў Кабінэтавай Рады і Рады Міністраў, спэцыяльна пасьвечаных дзеля ўсталеньня ўрадавых праектаў зьмены канстытуцыі.

„Рэформа" падаткаў.

Прэса падае, што ў хуткім часе пачнецца ў Міністэрстве Скарбу канфэрэнцыя ў справе рэформы падаткаў. Цяпер ў М-ве апрацоўваюцца дзьве новыя ўставы: аб падатку за будынкі ў вёсках і аб падатку ад маемасьці.

Нарада кангрэсу міжнароднага права ў Варшаве.

11 г. месяца ў Варшаве пачаліся нарады кангрэсу міжнароднага права.

На першым-жа паседжаньні разглядалася справа выдаваньня праступнікаў, якія хаваюцца ў другой дзяржаве.

Пасьля рэфэратаў афіцыяльных прадстаўнікоў некаторых урадаў (як'грэчаскага) гэтая цяжкая „праца" дэлегатаў капіталістычных дзяржаваў закончылася, хоць ей яшчэ далёка было да канца. Такое перадчаснае закончаньне разгляду гэтай справы тлумачыцца тым, што пан міністар справядлівасьці Мэйштовіч выдаў банкет для ўчасьнікаў кангрэсу, куды яны, разумеецца, і пасьпяшылі ў поўным камплекце.

У наступным дні кангрэс ізноў прыняўся „грызьці" праступнікаў (іх справу), але ўсё-ж прышоў да старога вываду — не выдаваць палітычных праступнікаў. А пасьля ізноў, вядомая рэч—раўт у салях багатага готэлю „Брыстолю", з'рганізаваны дзеканам і варшаўскімі адвакатамі, а наступна — паездка па Віслe. Аб далейшых „працах" няма чаго казаць, бо ўсе яны аднолькава праходзяць і аднолькава закончваюцца—гулянкамі за працоўныя грошы.

А працоўныя ўсё гнуцца і гнуцца і нецярпліва чакаюць, калі ім палепшае...

Лячэньне гандлю.

Па інфармацыях прэсы, у канцы цякучага месяца маецца быць склікана Эканамічным Камітэтам Рады Міністраў спэцыяльная камісія дзеля апрацаваньня праектаў „направы" польскага гандлю, які, як ведама, дае вялізарныя, штомесячна-ўзрастаючыя недахопы.

Бязумоўна, што „лячэньне" гандлю, як наагул і ўсякай іншай галіны дзяржаўнага жыцьця, пры сучасным (буржуазным) дзяржаўным ладзе, адбудзецца коштам зьбяднеўшых да апошняга шырокіх працоўных масаў.

Але з тэй прычыны, што польскі гандаль стала лечыцца, і навет заграпічнымі дактарамі, відаць, што і гэтым разам польскі гандаль толькі „падлечыцца", як хворы ўколамі, на некаторы час, што далей, то меншы.

Ці толькі вылечыцца?

Камуністычная дэманстрацыя.

10 г. месяца, вечарам на пляцы Казімера Вялікага ў Варшаве пачалі, як інфармуе 232 нумар „Rzplitej", з усіх бакоў сходзіцца групы камуністаў. Па змоўленым знаку камуністы злучыліся, распусьцілі свой сьцяг і пашлі паходам, у сіле 300 чалавек.

Паход зьліквідаваны паліцыяй. Арыштавана „колькінаццаць найкрыклівейшых крыкачоў" і забраны сьцяг з антыдзяржаўнымі лёзунгамі.

Аружжа ня ўжывалася.

Арышты камуністаў.

Апошнімі днямі ў Лодзі арыштаваны, як падае прэса, вядомыя камуністычныя дзеячы, Шпіцбэрг і Занд, быццам ужо даўно разьвіваўшыя шырокую „антыдзяржаўную" работу, асабліва ў перадвыбарным часе, калі Шпіцбэрг навет фігураваў на пасольскім сьпіску № 37.

У апошнія дні яны быццам вялі агітацыю проці зьезду легіёністаў у Вільні.

У часе рэвізіі быццам знойдзена „шоо" кампрамітуючых і абцяжаючых дакумантаў.

Яшчэ арышт камуністаў.

У Варшаве арыштаваны нейкія Аляксандар Олехоўскі і Францішак Яблоньскі. У апошняга быццам знойдзены ў кішэні рэвальвар і камуністычныя адозвы.

З Польшчы эмігруюць.

Паводле галоўнай статыстыкі, у мінулым годзе з Польшчы выэміґравала 200,000 чал.

З гэтага ліку 40,000 земляробных работнікаў, якія працуюць у Нямеччыне.

У гэтым годзе, кажа статыстыка, выяжджае сярэдня па 600-1000 чал. у тыдзень.

А дзе перадвыбарныя абяцанкі Б. Б., што працоўныя атрымаюць працу?!

Рэха львоўскай „афэры".

У сувязі з арыштаваньнем маёра д-ра Урбановіча, у Львове арыштавана яшчэ 8 чалавек—4 вайсковых і 4 цывільных. Усім ім закідаюцца надужыцьці ў справе пабораў.

Заграніцай.

Водгукі віленскай прамовы маршалка Пілсудскага ў нямецкай прэсе.

Сацыялістычная прэса ў Нямеччыне падчырквае спакойна паэтыцкі зьмест віленскай прамовы марш. Пілсудскага, ад якога ўвесь сьвет спадзяваўся нейкіх сэнсацыйных заяваў адносна Літвы, навет ані воднага разу не ўспамянутай высокім аратарам. Наадварот, кажа орган сацыялістаў, прамова ад-

Мэрэжка.

ШТО РАБІЦЬ?

(Маленькі фэльетон).

— Вось знайшоўся яшчэ адзін дурань на сьвеце! — скажаце, мусіць, таварышы сяляне, прачытаўшы гэтую назву.

— Чалавек што дзень працуе, як той сухарэбры вясною конь у плузе, а паны ў Вільні ловяць сабе „гавы" ў паветры, ды яшчэ будуць нас вучыць, што рабіць!

Рэч зразумелая, што такая ўвага зусім слушная.

Але, каб абмінуў мяне гэты чудоўны ад вас кампімэнт „дурня", дык я пастараюся неяк высьвятліць гэтае няшчаснае слова.

Вось-жа... што рабіць?

Само сабою, што гэта „што рабіць" не датычыць ані панядзелка, ці там аўторка, або серады і г. д., а толькі... нядзелі.

Вось тут і загвоздка. Бо „хрысьціянін" прызвычаіўся да працы, як прыкладам, польскі ўрад да падаткаў, а панствовая паліцыя да арыштаў і караў, дык калі прыйдзе ўжо тая, „гасподняя нядзеля", то ня ведае, што тады і начаць.

Такая, бачыце, бяда!... І вось я хацеў-бы неяк парадзіць незарадным утой беданьцы.

Вось-жа: што, напрыклад, рабіць у гэтую няшчасную нядзельку?

Н-ну, мая рада была-б вось якой:

Нядзеля. З неба ўсьміхаецца сонейка, дыямэнтамі бліщчыць раса, таксама паблісківаюць да сонца багнэтамі і паліцэйкія, што шукаюць па сяле „гуза" або „сталае мамы"...

Як усё на сьвеце ня робіцца бяз прычыны—так і нядзеля завецца нядзелю не бяз прычыны.

Як злодзей завецца злодзеем праз тое, што крадзе, (але бываюць, праўда, і такія выпадкі, што ярага злодзея прызываюць яшчэ: дэфраўдант. Але каб вырабіць сабе такі тытул, дык трэба, што найменш—хаця колькінаццаць тысячаў злотых „шмаргануць" з якой небудзь касы) — гэтак і нядзеля паходзіць ад слова: ня дзелай (не рабі).

Вось-жа, як не рабі — дык у нядзелю можна сабе ляжаць, чытаць і словам: адпачываць па цэлатыднёвай працы.

Але так рашуча, божа, барані вас ад такога граху, вы не рабеце!

Вы ўсё-ж-ткі ўставайце, як можна, найраней.

Уставайце і якуюсь гадзіну чухайцеся.

Пры гэтым дазваляецца вам трошкі пасварыцца з жонкаю і поўкапшука махоркі высмаліць, ну і поўгадзінкі шчыра памаліцца за тое, што град вам выбіў жыта, сэквэстратар забраў палатно, поп за хрысьціны 20 злотых, а абшарнік яшчэ, дай яму божа панаваньне—зарабляць у сябе да 80 грошаў у дзень даець.

Канчаючы пацеры, адбейце колькі паклонаў, моцна пацалуйце на зямлі пыл і потым ідзеце галіцца да кума.

Брытва ў кума грамадзкая, камуністычная і вострая, як тая жыдоўская сякера.

Голіць заўзята—з шкураю, карэньнямі і барадаўкамі.

Пагаліўшыся — шпарка вяртайцеся дахаты, ды яшчэ шпарчэй апранайцеся, ды сьпяшайце да царквы.

Зразумела, што спазьніцца вам ня можна. Гэта—грэх і то грэх вялікі не дараваны.

Цяпер так і час, што за зьядзеньне аднае паскудненькае бульбінкі могуць хрысьціяніна запакаваць у пекла, аж на самае дно.

А навошта вам гэткія няпрыемнасьці? Навошта вам кіпець у смале, ды яшчэ, можа пазьней, і падатак за яе плаціць?!

Відавочна, што ідзеце ў царкву нашча і... сьпяшайцеся такі. Бо як за ежу, гэтак і за апазьненьне на набажэнства, як таксама і за спаньне пад час набажэнства царкоўнае сьвята карае пеклам.

Праўда, што можа быць і гэтак, што ў самую нядзелю, у бліжэйшым сяле, ці мястэчку адбываецца сялянская зборка, або работніцкі мітынг.

Вас запрашаюць, і—як відаць—варта-б пайсьці туды.

Але вы рашуча ня ідзеце! Першае таму, што тамака будзе вялікая таўкатня народу, а падругое... грэх такі, бачыце, ісьці туды.

Тамака-ж зьбіраюцца самыя камуністыя і грамадоўцы. То-ж там самыя бязбожнікі...

На вошта вам туды ісьці?

Бо-ж уся гэтая галота крычыць на сходзе, што хоча зямлі панскае і волі, бо-ж яна хоча роўнасьці паміж людзьмі на сьвеце, бо-ж яны там гавораць пра забастоўкі і раяцца, як-бы гэта змагацца за сваю лепшую долю...

А што вам да ўсяго гэтага, калі вы маеце сваю зямлю (паўморга), волю да працы і да падаткаў таксама—вось-жа вы—самастойны гаспадар!

Каму-б вы пакланіліся, або дзе зарабілі-б 80 грошаў, як-бы паноў прагналі?

Відавочна, што ідзеце да царквы!

Там і поп добры і пах сьвечак чудоўны і казаньне смаглае і добра вас там „вымасожуюць" лапцямі пад рэбры...

У полудзень выйдзеце сабе з царквы і мокры, як сьлімак, і вымешаны, як цеста, і п'яны ад сьвечнага чаду, быццам ад гарэлкі.

Пасьля царквы спажывайце абед.

У нас, сялян, абед чудоўны і складаецца па-панску аж з трох сабе патраваў: бульбы з юшкаю і хлебам, картоплі з сольлю і поліўкаю з часнаку, ды бурды з парожнім ды цьвёрдым, як пасьцель, агурком.

Па абедзе, памалецеся, закурэце сабе такога тытуну, што дымам з яго можна было-б усіх паноў, як газамі, выдушыць — і ідзеце ў сад, або ў салому да пуні.

Потым уставайце і ідзеце да чытальні.

Але, божа вас барані заходзіць у сярэдзіну!

Там-жа-ж бязбожныя газэты чытаць будуць, там-жа-ж скажуць у сябры запісацца, газэту выпісаць, а можа яшчэ—з намі сьвятая сіла—і ў сялянскі прафсаюз запісацца!

Ой, ёй, ёй! чаго ўжо па тых чытальнях не вырабляюць.

нага з чалавых паварыроў польскіх легіяністаў ген. Рыдза-Сьмiглага мела зусім іншы характар: Ен выразна заявіў, што марш польскіх легіянэраў, распачаты 6-га жніўня 1914 г., яшчэ ня скончаны, дык трэба, — каб яны былі гатовы ў кожную хвіліну прадаўжаць далей гэты марш — пад паваднрствам свайго каманданта... Кірунак гэтага маршу, у яго ўнутрана-палітычнай галіне, указвае рэзалюцыя зьезду, заклікаючая легіянэраў „падтрымаць Маршалка ў яго намерах у галіне перагляду Канстытуцыі“. Газэта такім чынам бачыць у віленскай прамове марш. Пілсудскага „доказ залагоджаньня ў палітычных стасунках польскіх“, хаця наагул ня лічыць зьліквідаванай небясьпеку польска-літоўскага канфлікту“.

Цэнтравая прэса таксама сьцьвярджае неспадзявана лагодны, „высока - паэтычны стыль“ прамовы, пазбаўлены „звыклых марш. Пілсудскаму моцных выражэньняў“... У Бэрліне былі страшэнна зьдзіўлены такім зваротам справаў—у прамове, незакрануўшай навет ні водным словам дражлівых пытаньняў унутранай ці вонкавай палітыкі.

Нацыяналістычная прэса падчырквае вялікую сілу марш. Пілсудскага над адданымі яму легіянерамі, якія ў руках Пілсудскага зьяўляюцца бязумоўна пакорным яго волі прыладам. Хаця прамова і не зьмяшчае ў сабе выразных ваенных пагрозаў, скіраваных у бок Літвы, аднак-жа, бязумоўна, мае агульны палітычны зьмест — у станоўчай заяве, што „Вільня, як мілая сэрцу Пілсудскага, павінна на ўсе вякі астацца польскай“...

Адна з газэтаў тонка кажа, што — уся гэта „паэтычная рамка і акраса“ прамовы артыстычна замаскоўвае гэты выразна палітычны зьмест і мэты прамовы: катэгарычную адмову Літве ў справе Вільні і адначасна ўздым патрыятычных пачуцьцяў легіянераў і ўсяго польскага грамадзянства і заклік іх стаць цясьней навакол свайго павадыра—на выпадак патрэбы—„Бараніць Вільню“...

Дэманстрацыя радавага флёту—на карысьць Літвы.

Балтыцкая эскадра радавага флёту, якая адбывала манэўры каля швэдзкіх берагоў, выслала значны атрад ваенных караблёў—пад Клайпэду. Нямецкае агенства цьвердзіць, што гэта—марская дэманстрацыя з боку радавага ураду — процi Польшчы і на карысьць Літвы—у зьвязку з зьездам легіянераў у Вільні... „Радавая Расея заяўляла некалькі разоў, кажа нямецкае агенства, што не дапусьціць польскага націску на Літву“.

Добрае ўражаньне ў Маскве — ад нямецкага кроку перад польскім урадам — у літоўскай справе.

—Кіруючыя колы ў Маскве, вельмі абураныя аднабокім націскам нямецкага ўраду ў Коўне—поруч з англа-францускай дыпляматыяй, — цяпер вельмі здаволены суадказным націскам нямецкай дыпляматыі і на польскі ўрад—у тэй самай справе — польска-літоўскага спору. „Известия“ пішуць, што гэты новы крок нямецкай дыпляматні зроблены ў значнай меры—пад уплывам самога Літвінава, які дзеля гэтага, відаць, асабіста паехаў у Бэрлін. Як ведама,—пасьля станоўчай рады нямецкага пасла ў Коўне літоўскаму прэм'еру — „больш практычна падыйсьці да справы паразуменьня з Польшчай“ — высокі чыноўнік нямец. мін. загран. спраў зрабіў візыту польскаму паслу ў Бэрліне і заявіў яму, што нямецкі ўрад не дапусьціць паважнага (чытай: ваеннага) завастрэньня польска-літоўскага канфлікту.

Пэўне-ж — на такі крок нямецкай дыпляматыі ўплынулі і тыя пагрозы, якія зьявіліся ў літоўскай афіцыяльнай прэсе—пасьля аднабокага націску нямецкага пасла ў Коўне. Бо-ж—у органе літоўскага ўраду пачалі зьяўляцца артыкулы, у якіх разважаліся магчымасьці і карысьці... беспасярэдняга паразуменьня Літвы з Польшчай, парваўшы цалком з літоўскай арыентацыяй на Нямеччыну, прыязьнь з якой не дае Літве ніякіх спадзяваных выгадаў“...

Асабліва вострую крытыку выклікаў націск нямецкага пасла ў Коўні, як быццам зроблены ў паразуменьні з Англіяй і Францыяй з боку радавай прэсы. Дык нямецкі ўрад паў-афіцыяльна вытлумачыў, што нямецкі крок у справе залагоджаньня польска-літоўскага канфлікту — быў зроблены — на абодва бакі — зусім самастойна і незалежна ад крокаў з боку Англіі і Францыі. Частка польскай прэсы вельмі абурана на аднолькавую перасьцярогу з боку нямецкай дыпляматыі і па адрасу польскага ўраду; другая даводзіць, быццам нямецкае мін. заграніч. спраў — толькі паведаміла польскага пасла аб тым кроку, які нямецкі пасол зрабіў у Коўне.

Нямецкая прэса ўсьцяж піша аб „польскіх манэўрах на літоўскім пагранiччы.

Паважная нямецкая біржавая газэта ўсьцяж—навет пасьля высьвятленьняў польскай ноты да Лігі Нацыяў — піша аб тым, быццам польскія манэўры на літоўскім пагранiччы ня толькі маюць адбыцца, але лічба войскаў, якія маюць прыняць учасьце ў манэўрах, у 10 разоў перавышае баявыя сілы Літвы. А гэта, цьвердзіць газэта, даказвае выдатна ваенны характар гэтых манэўраў.

„Кур. Варш.“ 11./VIII.

Літоўскі ўрад быццам не згаджаецца на перагаворы ў Жэнэве.

Агенства „АТЕ“ даносіць: Афіцыяльны орган літоўскага ўраду „Літоўс. Рэха“ піша, што чуткі аб тым, быццам літоўскі ўрад прымае польскую прапазіцыю, каб польска-літоўскія перагаворы прадаўжаліся ў Жэнэве 30 жніўня, — непраўдзівыя. Быццам прапазіцыя Польшчы наагул ня будзе прынята Літвой (?).

Літоўцы—аб фэдэрацыі з Польшай.

Афіцыяльны орган літоўскага ўраду зьмяшчае цікаўны артыкул — пад загалоўкам: „Што значыць плянаваная Пілсудскім фэдэрацыя з Польшчай“. Газэта піша, наміж іншым, што—ніводны з народаў у Польшчы—ані беларусы, ані літвіны, ані ўкраінцы ня пойдуць ні на якую фэдэрацыю з Польшчай, перадусім дзеля таго, што проста—ня маюць даверра да палякоў.

„Кур. Варш.“ 9./8.

Льлёйд-Джордж аб Трактаце Кэллога.

На мітынгу, наладжаным лібэральнай партыяй у Стокфільдзе, сказаў вялікую прамову павадыр партыі Льлёйд-Джордж, у якой востра крытыкаваў Трактат Кэллога. Аратар даводзіў, слушна, што—такія трактаты, калі яны адначасна не прадбачаць зьмяншэньня збраеньняў,—ня маюць ніякіх — ані сэнсу ані карысьці. Заключэньне такіх трактату, маючы быццам „маральнае значэньне“,—зьяўляецца ў запраўднасьці толькі „фарсам, які ўдадатак амаль не заўсёды канчаецца трагічна“...

Ці ня будзе адкладзена падпісаньне Трактату Кэллога?

У Лёндан даносяць з Вашынгтону (сталіца Амэрык. Штатаў), быццам у справе падпісаньня Трактату Кэллога сярод палітычных колаў Злуч. Штатаў зьявіліся нейкія сумлівы. Быццам, даведаўшыся, што ані Чэмбэрлен, ані Штрэзэман ня прыедуць асабіста ў Парыж, і сам Кэллог пастанавіў астацца дома. З Парыжу-ж пішуць, што дагэтуль толькі 2 дзяржавы далі адказ на запросіны францускага ўраду прыехаць у Парыж—на подпіс Трактату.

„Міратворчая“ Амэрыка.

13-га жніўня—значыць роўна за 2 тыдні перад урачыстым падпісаньнем у Парыжу Трактату Кэллога аб „вырачэньні ўсялякай вайны, як прыкладу дзяржаўнай палітыкі“ ды абвяшчэньні вайны „міжнародавым угалоўным праступленьнем“, амэрыканскія лётчыкі закідалі бомбамі з аэрапляваў апошнія крыеўкі паўстанцаў у Нікарагуа над ракой Коко, рэгулярныя сілы якіх, як ведама, разьбілі канчальна ў гэтай „незалежнай дзяржаве“... амэрыканскія войскі. Такім чынам, міністар-міратворэц, пакуючы ўжо свае валізкі дзеля падарожы ў Парыж—на трыумф амэрыканскага „міратворства“, — мае аднак-жа час даваць загады—масовага зьнішчажэньня людзей у маленькай, але вольналюбівай, рэспубліцы ў Амэрыцы, пэўне-ж—ня лічачы гэта вайной...

Нямеччына будуе новы браняносец.

Нямецкі ўрад пастанавіў распачаць будову новага браняносца, здабыўшы для гэтага патрэбныя грошы — шляхом эканоміі ў другіх галінах бюджэту.

„Урад нацыянальнай здрады ў Эгіпце“.

У Александрыі адбылося сабраньне дэлегатаў партыі эгіпецкіх нацыяналістаў („ВАФТ“), на якім прынята рэзалюцыя, абвясьціўшая ўрад Махмэда-пашы — „ўрадам нацыянальнай здрады“. — Рэзалюцыя кажа, што гэты ўрад — сваей ўгодай і пакорнасьцяй Англіі ў адну хвіліну зьнішчыў здабытыя рэзультаты даўгалетняй барацьбы і працы эгіпецкага народу. Апошні крок гэтага ўраду—разьвязаньне парляманту — гэта—ўдар па найцэннейшых скарбах народу—як парадак, вольнасьць і цывілізацыя...

Амэрыканская пазыка новаму Кітайскаму ўраду.

У Нью Іорк прыехаў міністар фінансаў новага кітайскага ўраду Сунг, які канфэраваў з мін. скарбу Злуч. Штатаў Мэллонам—у справе значнай пазыкі, якую мае Амэрыка даць Кітаю.

Зьезд англійскіх мілітарыстаў у Іўры (Францыя).

З паводу 14-их угодкаў абвешчаньня вайны немцам, як піша Віленскае „Słowo“, (№ 181), у спосаб „нязвыклы і грандыёзны“ з Англіі прыехала каля дзесяцёх тысячаў чалавек у францускі горад Іўр (недалёка ад Парыжу), каб „пацешыцца“ ўспамінамі з мінулай вайны, паглядзець на астаткі акопаў, дзе яны калісь „геройска біліся з немцамі“. Пэўна-ж на такую экскурсію ня прыехалі работнікі-пралетары, бо-ж іх мала цешаць тыя месцы, дзе лілася людзкая кроў—ды мардав. Узаемна работнікі і сяляне, падзеленыя гранічнымі кардонамі і нацкаваныя буржуазіяй адзін на другога. І да таго досыць каштоўная гэта „пацеха“, каб на яе, навет маючы ахвоту, мог сабе дазволіць працоўны. Можна дагадвацца, хто прыехаў з гэтай экскурсіяй і каго „цешаць“ гэтыя кашмарныя ўспаміны з сусьветнай вайны.

Але і францускія камуністыя не драмалі і таксама гатовіліся на дзень зьезду.

У суботу, 4-га жніўня, яны сабраліся ў аграмадным Парыскім цырку для абгаварэньня гэтай справы і, пасьля гарачых прамоваў сваіх павадыроў, пастанавілі сабрацца назаўтра ў Іўры і наладзіць антымілітарыстычную дэманстрацыю, як пратэст супроць усялякай вайны, супроць спробаў і думак аб новым усясьветным пажары, аб якім не пакідаюць свае лятуценьні кіраўнікі і павадыры міжнародавага капіталізму. Калі пачалі выходзіць з цырку, паліцыя паарыштоўвала павадыроў і больш дзейных сяброў партыі і замкнула да „пакі“. Не абыйшлося, вядома, пры гэтай чыннасьці, бяз энэргічных штурханцоў, гумовых палак і г. п. „радыкальных сродкаў“. Але, ня гледзячы на гэтую тропку, назаўтра ранютка, пасыпалі яны, як мурашкі на цягніках, на ровэрах, самаходах, а шмат якія і на сваей уласнай „парцы“ — пяшэчкам—у назначанае месца. Паліцыя абсадзіла ўсе вагзалы, усе сьцежкі-дарожкі і ня ўпускала ў места камуністых і падазроных тыпаў, „уразумляючы“ (ведама, якім спосабам!), каб тыя варочаліся назад.

Але-ж гэтыя „злыдні камуністыя“, нераўнуючы, як тыя шчуры, усё-ж такі пратачыліся нейкім „цудам“ і па вуліцах Іўру разыдавала „чырвоная гвардыя“ „камуністычныя баюўкі“ і лучыліся ў грамадны натоўп, маючы вядома ж і „трэфныя“ чырвоныя сьцягі з надпісамі — „Прэч з мілітарызмам“! „Далоў вайну“! і навет з рысункамі савецкага знаку — сярпа і молата. Але гэта камуністычная „пацеха“ ня трывала доўга. Сільныя аддзелы паліцыі і войска пачалі разганяць „чырванаскурых“. (Але, але, гэтак ужо вялічае манархістычнае „Słowo“—камуністых). З вялікім толькі трудом удалося разагнаць дэманстрантаў.

Мэр гэтага места (бурмістр — панашаму) камуніст (вось як у людзей, навет бурмістры ёсьць камуністыя!) у часе заарыштаваньня ставіў апор і пабіў моцна паліцэйскага.

Усяго арыштавалі, як падаюць адны газэты, каля 500 чалавек,—а другія, каля 1000, і прадзяржалі ў вастрогах да вечара. Спакайнейшых потым выпусьцілі, а галоўных „бунтаўшчыкоў“, штось каля 50 чалавек, судзілі і ўкаралі ад 3-х да 50-ці дзён арышту.

Як на нашы стасункі, дык гэта вельмі лагодная кара! Відаць, француская буржуазія, пабаіваецца гэтых „чырванаскурых“, баіцца, каб суровымі прысудамі занадта не раздражніць, ды ня вызваць ваўка з лесу!..

Прэса ў СССР.

У 1913 г. усяго разыходзілася ў Расеі 2 мільёны 500 тыс. штодзенных газэтаў. Бальшавікі давялі гэты штодзенны тыраж газэтаў да 7 мільёнаў 700 тыс. У кожным разе гэтыя лічбы цьвердзяць аб тым, што газэта у СССР пранікла значна ў глыб народных гушчаў.

Наша хроніка.

З зьезду легіяністаў. Як пішуць, падчас зьезду ў нядзелю з раніцы было бясплатна пачаставана ў „Ognisku“ (саля жалезнадарожнікаў) 1600 легіяністаў. А наступна, вечарам пасьля прамовы Пілсудскага ў салі рэпрэзэнтацыйнага палацу было бясплатна пачаставана 2.000 чалавек і, незалежна ад гэтага, у парку таго-ж палацу быў даны „скромны“ бясплатны падвячорак для ўсіх іншых учасьнікаў зьезду („Słowo“, № 185).

На гэтым „скромным“ падвячорку аднаго толькі піва было выпіта 15.000 літраў і зьедзена 48 кілягр. цукеркаў.

Адным словам, паны добра пагулялі. Цэлых 2 — 3 дні Вільня была ў іх „абняцьцях“. Проста праходу ня было.

Рэха „Грамады“. У хуткім часе маюць выйсьці з друку і будуць разасланы ўсім засуджаным у працэсе „Грамады“ матывы (прычыны) іх прысуду. Гэтыя прычыны зоймуць аж 40 аркушоў паперы звычайнага пісьменнага фармату.

Выйшла з друку (папольску) кніжка „Працэс Белар. Сял.-Раб. Грамады“, накладам і друкам п. Хамінскага, зьмяшчаючая толькі прамову адв. Патрусэвіча, але цалком. Прадаецца і ў беларускіх кнігарнях.

Выпусьцілі на свабоду. Арыштаваны ўноч з 10 на 11 г. м. перад прыездам Пілсудскага Шчасны-Пасынак, у панядзелак 13 г. м. быў выпушчаны на свабоду, з „браку доводув“. Вось, жыцьцё: то бяруць, то пускаюць, а спакою, як няма, так няма!

За ген. Балаховіча. 11 г. месяца Апэляцыйны Суд у Варшаве разглядаў справу быццам забойцы брата ген. Балаховіча.

Успомнены брат Балаховіча быў забіты пяць гадоў таму назад у Белавескай пушчы, якую ён высякаў.

Папярэдне гэтую справу разглядаў Акружны Суд у Беластоку і засудзіў А. Бойку на кару сьмерці, а трох яго сяброў: Бартасяка, Арцішэўскага і Ляшчука на вечны вастрог.

•Апэляцыйны Суд у Варшаве гэты прыгавар зацьвердзіў, пры чым пазбавіў іх карыстацца правам амністыі.

Кантрабанда ў Вільні. У Вільні ў аднаго з дворнікаў на Навагрудзкай вул. знойдзена 100 кілягр. нямецкай сахарыны і 52 кілягр. літоўскага тытуну. Сьцьверджана, што тавар паходзіць з кантрабанды.

Аб прыняцьці на службу былых жалезнадарожнікаў. Польскае міністэрства камунікацыі выдала 14 чэрвеня г. г. распараджэньне, паводле якога маюць прыймацца на жалезнадарожную службу ў Польшчы тыя з былых жалезнадарожнікаў, якія ня прыняты з браку месца.

Для былых жэлезнадарожнікаў, служыўшых яшчэ на расейскай жалезнай дарозе, гэта было-б вельмі добра, калі-б яны ўсе мелі ізноў атрымаць працу.

Дзеля гэтага заінтараваныя былыя жалезнадарожнікі павінны падаць заяву аб прыняцьці іх на службу ў Дырэкцыю Жалезных Дарогаў.

У заяве трэба падаць: 1) Імя і прозьвішча, 2) год нараджэньня, 3) месца пражыцьця, 4) калі ўступіў на службу, 5) ці служыў, як штатны, ці як кантрактовы, 6) дзе служыў, 7) калі пакінуў службу, 8) ад якога часу быў сябрам эмэрытальнага фонду 9) ці стараўся дастаць эмэрытуру (пэнсыю) і з якім вынікам.

Вельмі цікава, чаму гэта на польскай жалезнай дарозе раптам зьявілася столькі пустых месц?

Набор работнікаў у Францыю. У гэтым месяцы адбудзецца тры наборы работнікаў дзеля працы на ральлі ў Францыі. Набор адбудзецца: у Вільні—21 г. м., у Маладэчне 22 г. м., у Сьвянцянах — 23 г. м, Ад'езд у Францыю—25 г. м.—пасьля агульнай зборкі ў Вільні.

Паедуць нашы сяляне і то далёка ня ўсе працаваць на францускую буржуазію, пакінуўшы сваю зямлю ў руках асаднікаў.

Карэспандэнт газэты і напад на жыдоўскую школу (сынагогу). У сувязі з нядаўным нападам уначы на жыдоўскую школу ў Сьвянцянах, у якой былі выбіты ўсе шыбы (некаторыя навет з рамамі), паліцыя абвінавачвае ў гэтай справе нейкага Шульца, карэспандэнта „Dz. Wil.“ на Сьвянцянскі пав.

І вер пасьля такога бандытызму розным „Dzińnikam“.

Камуністычныя „тэхнікі“. Прэса інфармуе, што надовячы ў пагранічным раёне Міклашэвічаў (каля Івянца) арыштаваны 2 камуністычныя тэхнікі, пры якіх (як ведама!) знойдзены рад кампрамітуючых дакумэнтаў, сьведчачых аб іх сувязі з Менскім ГПУ.

Вялізарныя надужыцьці. Варшаўская прэса падае, што ў Т-ве Спальных Вагонаў у Стоўпцах выкрыты вялізарныя надужыцьці—аж да 300.000 злотых.

Вось дык „малайцы“ — на дробязь ня хочуць рук пэцкаць — зусім паамэрыканску!

Неўраджай у Баранавіччыне. Па апошніх даных статыстыкі, у Баранавіцкім павеце бурамі і градамі зьнішчана 40 працэнтаў збожжа.

Ведаючы добра становішча Баранавіччыны, баранавіцкі соймік зьвярнуўся апошнімі днямі да адносных уладаў з просьбай пазычкі ў суме 500 тысяч злотых на помач пацярпеўшым вёскам.

Не гаворачы аб патрэбнасьці хуткай дзяржаўнай дапамогі нашаму сялянству без звароту грашоў, прыходзіцца сумлявацца навет і ў тым, ці атрымаюць нашы сяляне гэтую крошачную пазычку.

Адна кара божая!

Зразумела, што вы сядайце сабе перад чытальнею на прызьбе і пыкайце люлькаю ды раз—у раз перад сабою сьплеўвайце.

Газэты вам ня пры чым.

Няхай сабе „паны“ пішуць у іх, што хочуць, а вы сабе самастойны гаспадар і патрабуеце газэтаў на цыгаркі, гаршкі накрываць, дзецям на забаўку, калі плачуць і... хіба яшчэ брусок ад касы завінуць.

Па за гэтым газэты вам не патрэбны. Што там у сьвеце чуваць? Дурнота!

Як змагацца за лепшае жыцьцё і сацыяльнае вызваленьне?—Таксама дурнота.

Аб усім гэтым вам скажа поп і паліцэйскі! Само сабою, што вам так седзячы перад чытальняю і час пройдзе хутка.

Нехта будзе апавядаць пра Італію, хтось пра Японію, хтось пра тое, як ён быў на вайне служкаю ў капітана і краў у яго папяросы, хтось пра канец сьвету, хтось пра бяду і кепскія часы...

А грамадою добра і апавядаць, добра і слухаць, добра і пасьмяяцца — грамадою добра навет і „бацьку біць“—кажуць людзі.

Зразумела, што часу на тыя апавяданьні і слуханьні ня многа, бо зазвоняць на „вячэрню“ да царквы.

Відавочна, вы зараз-жа ідзеце.

А тамака ўжо, браточкі, іншая справа.

Там чалавек трошкі памоліцца, трошкі падрэмле, а потым слухае гадзіны са дзьве, як поп чытае сваю газэту.

Дый цікавыя-ж там рэчы! Ня тое, што ў сялянска-работніцкіх газэтах на кожным радку: арышт, крымінал, забастоўка, сацыялізм, палітычны працэс і г. д.

Там пачуеце, як калісь сьвятому Антонію крукі што-дня хлеб насілі, як да сьвятое Варвары, ці Афрасіньні „нячысьцікі“ з грахом падлабуніваліся, які ў бога цяжкі палец, як каля Жыровіцкае крыніцы чуда зьявілася, як гэта, праз бальшавікоў, хутка станецца канец сьвету...

Чудныя рэчы.

Вось гэтак слухаў-бы і слухаў-бы, і слухаў-бы, а наастатку і сьвятым Антонім захацелася-б зрабіцца.

Бо што і казаць, куды лепш было-б „хрысьціяніну“, каб крукі яму насілі хлеб — як ён круком.

Вось—гэтак.

Вы толькі слухайце такіх рэчаў, хаця-б і да сьмерці.

А ў панядзелак досьвіта ўставайце, смаргайце дзяцей рэменем з-за вуха за тое, што галодныя і крычаць: „хлеба“, ды сквапна лайцеся з жонкаю, што ня мае навет і сьнеданьня для вас.

А яшчэ пазьней ідзеце ў двор і прасеце пана, каб прыняў вас да працы за 80 грошаў у дзень.

І ўсе будзе добра, бо-ж, што вы „за гаспадар“, каб аж, як чытачы, пры „газэтах сядзець“.

З украінскага—збеларушчыў М. Ш.

Сяляне ставяць грымаадводы.

Усім хіба ведама, якія вялікія няшчасьці прынясьлі сёлета буры Зах. Беларусі.

Усім ведама, што, апрача зьнішчэньня засеваў, буры ўсьцяж палілі пярунамі нашы вёскі.

І многія з нашых сялян у страху пазіралі на пажары ад пяруноў і, перапалоханыя, трацілі галаву ад гэтага і зьвярталіся з нямою мальбою да неба, просячы яго аб помачы. Але неба не зьвяртала ніякай увагі на іх просьбы, а йшчэ заядлей паліла пярунамі.

Але многія, яшчэ далёка ня значаць усе.

Былі і такія людзі, якія ня страцілі галаву ад няшчасьцяў, ня трацілі часу на пустую мальбу да жорсткага неба, а пачалі змагацца з сваім няшчасьцем—пачалі будаваць грымаадводы.

Такімі сялянамі, напрыклад, зьяўляюцца сяляне мястэчка Турца (ў Стаўпеччыне), пабудаваўшыя на каждай вуліцы па 2 грымаадводы, таксама вёска Погіры, Дзятлаўскай вол., Навагр. павету.

Мусім з радасьцю спаткаць гэта і аддаць чэсьць тым сьвядомым грамадзянам, якія далі прыклад усяму беларускаму сялянству і, наагул, грамадзянству, што ні ў якіх няшчасьцях, ні ў якіх выпадках ня трэба дый ня можна стаўпянець і глядзець валазянымі вачыма ўгару ці ўніз, ані чакаць чыей помачы,—а што трэба самым памагаць сабе ў кожным сваім няшчасьці і то навет не тады, як яно ўжо сядзе „на карк“, але навет прадбачыць яго прыход і не дапусьціць да гэтага.

А для рэшты нашых сялян няхай гэта ня будзе пустым прыкладам, які можна прапусьціць міма вушэй. Няхай кожная наша вёска на пачатак заложыць хоць па адным грымаадводзе, то і гэта шмат каго ўратуе ад бяды. А з часам, пашоўшы на гэтай дарозе арганізаванай самапомачы, дойдзем да таго, што над намі ня будуць панаваць ніякія пяруны—ні сьляпых нябесных стыхіяў, ні вызысківаючага і крыўдзячага нас людзкога самаўладзтва і стыхійнага зьдзеку.

Дык браты, Беларусы! Арганізуйцеся і будуйце сабе „грымаадводы“ ад пяруноў гэтых стыхіяў.

З Т-ва Бел. Школы.

Акружны зьезд Т-ва Бел. Школы ў Сьвіслачы.

Дня 22. VII. (ліпня) ў м-ку Сьвіслачы адбыўся акружны зьезд прадстаўнікоў Т-ва Бел. Школы з Ваўкавыскага і Бельскага паветаў.

Прысутных з правам голасу было 37 асоб і 13 асоб гасьцей. Зьезд адчыніў прадстаўнік Галоўнай Управы гр. К. Крук.

Па адчыненьні зьезду і выбару яго прэзыдыуму, забраў слова гр. Крук, які высьвятліў значэньне асьветы ў жыцьці кожнага народу і асобна яе заданьне ў руху адраджэнскім беларусаў. Успамінаючы аб прошласьці і традыцыі беларускага народу, аб яго даўнейшым культурным росквіту, аб паўстаньні літэратурнай беларускай мовы, падкрасьляе, што яна ёсьць старэйшай за мову польскую і расейскую, кажучы, што навет дзяржаўныя граматы, як статут беларуска-літоўск. князьства, пісаліся ў белар. мове. Пры гэтым прывёў словы паэты нашага краю Адама Міцкевіча: „Wszystko może być zniszczone ogniem i złodziejami,—ale pieśni,—nigdy!“, а пад песьняю мы разумеем усё тое, што духова стварыў беларускі народ.

— Мы, беларусы, маем свае помнікі!

Гэтыя курганы, разлогі, пахіліўшыяся крыжы над магіламі нашых прадзедаў — сьведчаць аб векавым змаганьні нашага народу, за яго быт і культуру. Аднак, ня, гледзячы на тое, што мы маем сваю традыцыю і гісторыю, што мы лічымся кілька-мільённым народам, жыцьцё наша наагул занепадае. Гістарычныя варункі апошніх часоў падзеялі так, што мы апынуліся ў хвасьце запраўды культурных народаў... Трэба кінуць усе высілкі на барацьбу з цемрай, на змаганьне за асьвету!

„У імя гэтага заклікаю Вас: складайце дэклярацыі на родныя школы, падтрымлівайце матарыяльна і маральна нашае Таварыства, і тагды толькі агульнымі сіламі беларускага працоўнага народу мы зможам перамагчы сучаснае ліха“!

Далей гаворыць сябра Т-ва Сымон Скепка ад Гарадзіскага гуртка. Ен падкрэсьлівае значэньне роднае школы славамі:

„Колькі-б нас чужынцы духова не калечылі—мы заўсёды застанемся беларусамі, бо гэтага вымагае закон жыцьця“!

У дакладах з месц выступаюць: ад Сьвіслацкага гуртка — Астапчык, які пасьля справаздачы аб дзейнасьці гуртка, у працы якога выявілася цэлы рад крыўдных і жорсткіх адносін з боку адміністрацыі, кажа словамі: „Усёж такі гурток працуе і не пакіне змаганьня за родную асьвету, пакуль ланцугі цемры ня спадуць з рук гаротнага беларускага народу“!

У далейшай справаздачы ад гурткоў Т-ва з вёсак: Грынкі, Дабравольля і Ліхасельцы,—скрозь чуюцца крыўдныя і сьвядомыя перашкоды з боку нясумленных адзінак улады. Пасьля выбараў Акружное Управы з падзякай выступае сябра Качаноўскі, які ад імя зьезду складае падзяку Галоўнай Управе Т-ва Б. Школы ў асобе яе прадстаўніка гр. Крука, канчаючы славамі: „Усе народы маюць права да асьветы, а таксама і мы, бо нам яе гарантуе навет канстытуцыя“!

У бягучых справах выступае з словам гр. Крук. Сваю прамову канчае славамі: „За адну ідэю згінулі Траўгут і Каліноўскі, за адну ідэю шмат лепшых сыноў Беларусіляглі касцьмі за гасло: „Нашу і Вашу Вольнасьць“!

Аднак, яшчэ сягоньня беларус змушаны палажыць шмат высілкаў, ахвяр, каб здабыць запраўдную вольнасьць роднае мовы і асьветы“!

Потым была прапянована ім-жа рэзалюцыя.

Дружнымі воплескамі была прывітана яго прамова.

На заканчэньне прапялі: „Ад веку мы спалі“. Бачучы і чуючы ўсё гэта, нявольна выступаюць сьлёзы на вачох, у каторых выяўляецца жаль і сум і, разам яшчэ большы запал да барацьбы з цемраю. Гэты дзень, дзень зьезду Акружнага Т-ва Бел. Школы ў Сьвіслачы, будзе адным з тых лепшых дзён, які ўвальлецца ў гісторыю беларускага адраджэнскага руху.

Чэсьць Вам, гурткі Ваўкавышчыны і Бельшчыны, няхай Ваша нязломная праца, праца ў найцяжэйшых абставінах паслужыць сымбалем змаганьня за лепшае заўтра!

Сябры з Наваградчыны.

Рэзалюцыя, прынятая Акружным Зьездам Т-ва Бел. Школы ў Сьвіслачы.

Зьездам была аднагалосна прынята, запрапанаваная гр. Круком рэзалюцыя, наступнага зьместу:

„Заслухаўшы даклад прадстаўнікоў: Галоўнае Управы Т-ва Белар. Школы гр. Крука і Гурткоў Т-ва—акружны зьезд Т-ва Бел. Шк. ў м. Сьвіслачы:

1) Катэгарычна пратэстуе проціў няпрыхільных адносінаў да працы гурткоў з боку адміністрацыі, якая систэматычна ўтрудняе культурна-асьветную працу Т-ву Бел. Школы.

2) Дамагаецца адчыненьня беларускіх школ, згодна зложаных дэкляарацыяў.

3) Дамагаецца, каб існуючыя беларускія гімназіі субсыдыяваліся ўладамі.

4) Дамагаецца адчыненьня беларускіх вучыцельскіх курсаў і сэмінарыяў на кошт ураду.

5) Пратэстуе проціў незацьверджаньня Выдзелам павятовым у Ваўкавыску 300 зл., высыгнаваных мястовай Радай для культурных мэтаў Сьвіслацкага Гуртка.

6) Дамагаецца якнайхутчэйшага звароту будынку, апячатаванага ў свой час паліцыяй, які быў (будынак) прызначаны пад бібліятэку-чытальню Сьвіслацкага Гуртка.

7) Ганьба Сьвіслацкай пажарнай стражы, якая ў асобе яе „прэзэса“ Здановіча, не дае салі для спэктакляў Т-ву Беларускае Школы і гэтым самым затрымлівае беларускую культурную працу.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

„Сіла“ гміннай Рады!

(Слонімшчына).

На адным з паседжаньняў Чамерскай Гміннай Рады пры разглядзе гміннага бюджэту рада, між іншым, ухваліла 750 злот. у год на Віленскую Бел. Гімназію, у якой вучыцца значны лік дзяцей з Чамерскай гміны.

Аднак, як кажуць: „смашны бабе гарэх, ды зубоў бог ня даў“—Так яно сталася і тут.

— Нашто „хамам“ навука — падумаў Слонімскі павятовы Соймік, дзе большасьць буржуазных прадстаўнікоў — і ўхвалу Гміннай Рады адкінулі. Заместа таго, каб даць дапамогу бедным сялянскім дзецям у Віл. Бел. Гімназіі, Соймік палічыў патрэбным даць 400 зл. на „Школу Рольнічу“ у Грыбаве каля Слоніма, ня гледзячы на тое, што ў гэтай школе адзін толькі вучань з Чамерскае гміны, а рэшта прыехаўшыя дзесь з Пазнані.

Вось гэта дык „дэмакратыя“. Адным словам! К. Р.

Напад.

(м. Астрына, Лідзкага павету).

У сакавіку прыехаў да нас у Астрыну, на мейсца другога папа, нейкі Зубовіч. Гэты поп Зубовіч адразу паказаў свае аблічча і зрабіўся шчырым памочнікам першага.

Малыя дзеткі перад Велікаднём, хочучы зарабіць сабе па некалькі грошаў, пайшлі на яго поле шукаць хрэну. Як убачыў гэта поп Зубовіч, дык і ён, і яго пападзя, і сынок, хоць малы, але ўсім ужо вядомы, беглі за дзяцьмі з кіямі, абгаварвалі астатнімі славамі, цкавалі сабакай і адбіралі хрэн.

14 траўня прыехаў да яго тоўсты-пратоўсты „Zastępca“, які і стаўся папом Краскоўскім—сябрам кансісторыі. Гэты астатні, адсапеўшыся з дарогі, пачаў працаваць. Паклікаўшы дзякоў 16/V і напужаўшы іх звальненьнем з пасады, прымусіў іх і сам пайшоў з папом адбіраць гарод, які належыць Н. Жалуцкаму. Паслушныя—духоўныя рабы, узброеныя віламі ды кіямі, прыйшлі на чужую зямлю, ды пачалі кіравацца па-своему.

На запытаньне Жалуцкага, якім правам яны прыйшлі на чужую зямлю?—кіраўнік нападу, поп Зубовіч, які ня прызнаў ні паліцыі, ні якой другой улады, адказаў, што ў вайне няма ніякіх правоў, а толькі стратэгія, і пачаў лаяць усялякімі абразьлівымі славамі жонку Жалуцкага, да сьмерці напужаўшы яе і дзяцей. У гэты час надышоў солтыс і адабраў у ваякаў вілы. Наскочылі, паліцыянты і такім чынам да „крававага бою“ ня было дапушчана. Не здаволены гэтым, „Zastępca“ пачаў лаяць бедную жанчыну, якая хацела зарабіць на кавалак хлеба, прагнаў яе з гароду Жалуцкага, лаяў, нашто яна жыду робіць і г. д. За гэтую справу Жалуцкі ня мог даравацт ваякам і паслаў скаргу да Мітрапаліта.

Поп Зубовіч на гэтых днях хацеў узяць за тэстамант з беднай удавы 40 злотых, але яна ня мела іх і таксама паскардзілася духоўным уладам.

Каб палегчыць свае жыцьцё, нашыя папы пачалі скарочаваць службы царкоўныя (набажэнства), а дзяцей парахвіяне ўжо хаваюць самы.

Бедны ўнук Астрынскіх мук.

Да барацьбы!

(В. Труханавічы, Наваградзкага пав.).

Ні на кім другім, а на сабе, на сваей уласнай скуры адчулі мы, як цяжкае жыцьцё працоўных мас, цемната якіх дазваляе кожнаму над імі зьдзекавацца. Ні мы, ні нашыя дзяды, ні прадзеды ня бачылі сьвету... Маладое нашае пакаленьне расьце, як дзікія каноплі...

Але настаў час, калі гэтая працоўная маса, закутая ў цемру, пачынае змагацца за свае правы і здабываць іх у цяжкай барацьбе. У сёнешн. час бацькі, маючыя дзяцей, не павінны пакінуць іх цёмнымі, а супольнымі сіламі бароцца за іх асьвету ў роднай школе і ў роднай мове, дзе яны добра зразумеюць навуку і будуць змагацца з нядоляй працоўнага народу.

Падалі і мы дэклярацыі на ўрадавую беларускую школу з надзеяй, што нашыя дзеткі будуць вучыцца ў роднай мове, убачаць сьвет і каму ён сьвеціць.

Але прыйшла... адмова!

Браты! Ці гэтаму канец? Ці мы сіл ня маем? Ці застанемся далей у цемры? Ці-ж мы не пераможам?

Дык усе да працы, да барацьбы! Складайма яшчэ раз дэклярацыі, і яшчэ раз, дзесяткі разоў, аж пакуль не даб'ёмся таго, што нам належыцца. Т-разан.

Уплыў „Заходняе“ культуры.

(Слонімшчына).

Увосені 1927 г. на дарозе паміж Слонімам і в. Чамярамі адміністрацыя пачала рэмантаваць невялічкі кавалачак, прыблізна паўкілямэтра, шасы.

Ну, што-ж?

Разбурыць, надта хутка разбурылі. Але вось зрабіць ніяк ня могуць! Хоць гвалт крычы!

Колькі грошай, ужо на гэты "рамонт" страцілі, дык і сказаць трудна. Якіх „лякарстваў“ ня ўжывалі! Нічога не памагае. І ўжо праходзіць хутка год, а шаса, як ня зроблена, дык і ня зроблена. Возьмуць, укатаюць, то за-шмат, то за-мала. А цяпер ужо і „spokój dali“. Ня ведаюць, што рабіць.

А з вёскі Чамяроў адзін селянін, з вясковай адукацыяй, бярэцца за чатыры дні адрэмантаваць.

Аднак, адміністрацыя чамусьці не згаджаецца! Відаць, баіцца каб „мужык“ „не пасадзіў у калошу“ шматлікіх „інжэнераў“? На аўтамабілях што-дня прыяжджаюць гэтыя „інжэнеры“ — думаюць, думаюць, бедныя, і ні да чаго не дадумаюцца.

Вось, што значыць уплыў заходняе „культуры“. В. Б.

Нам пішуць яшчэ, што:

× У вёсцы Хаценчыцы, Вялейскага пав., прысланыя з „заходняй“ культурай асаднікі гуляюць у дабрадзеяў. Каб паказаць сваю „дастойнасьць“ перад хлебадаўцамі і „вышэйшасьць“ перад мясцовым сялянствам, пачалі асобна зьбіраць ахвяры на пацярпеўшых ад паводкі ў Галіцыі. Сабралі ўжо 94 злот. але... нікуды не паслалі. Аб гэтым даведалася ўлада і асаднікі нібы то папаліся... Але здарылася няшчасьце ў людзей: у канцы сакавіка ў в. Карнавічах, Хаценчыцкай вол., згарэла 7 гаспадарак, амаль што з усімі будынкамі. Вось і „ахвяру“, хоць па прыказу, але прыйшлося такі аддаць пагарэльцам.

Вось, дык „дабрадзеі“!

× У вёсцы Рацавічах, Вялейскага павету поп Я. Грынкевіч зьяўляецца ворагам асьветы і культуры. Гаворачы казаньне ў царкве, лаяў ён тых, што выдумалі радыё, тэлефоны і іншыя культурныя рэчы, якія, па яго разуменьню, робяць насупроць волі божай і божай „сьвятыні“, а тых, хто ўжывае іх, прыраўняў да сьвіней. У сваім казаньні закрануў таксама і асьвету. Накінуўся ён з лаянкай на нейкія „развратныя“ кніжкі. Якія-ж гэта „развратныя“ кніжкі і скуль яны да нас зьявіліся?

Вось „разумныя“ духоўнікі! Вы стараецеся, каб народ і далей жыў у несьвядомасьці, з якой вы карыстаецеся, кажучы „красамоўна“: „Нашто мужыку асьвета?! Слухай „свайго“ папа, маліся богу, складай на царкву, як мага, больш ахвяраў (а сам хоць з голаду памірай!), і будзеш „спасён“ і атрымаеш „царство небесное“.

Але народ не паддаецца вашым „цепятаньням“, ён ужо пазнаў вас, выкінуў забабоны з галавы і ідзе моцнай ступою да асьветы.

× У м-ка Новы Пагост у 1927 г. прыехаў на „агульную радасьць“ новы поп. Па ўсіх вонкавых адзнаках быў падобны да старога: чорная шырокая барада, халат роўна пят, але вочы не такія, як у інквізытара, дык можна было спадзявацца на добрыя пэрспэктывы.

Але вось, прыйшоў да яго перад сьмерцяй спавядацца хворы Сым. Дзяменьцяў. Наш поп (душа яму падказала, ці што!) пазнаў адразу, што мае „дармавіка“, але усё-ж запытаўся „кругленькіх“. Вядома той, апрача скуры ды касьцей, нічога ня меў. Не памагло даклярываньне, што аддасьць „ганарар“, калі паздаравее. Але поп „слушна“ адказаў, што і яму ніхто нічога дарма не дае, а калі ня маеш чым плаціць, дык няма чаго галаву дурыць.

Зусім ня поп, а... „філянтроп“! Ці ня праўда?

× У м-ку Трабы, Валожынскага павету, ёсьць гэтак званыя „ідэйныя“ людзі, якімі зьяўляюцца С. Д—ч, Ю. К—ч, і П. Р—ч. Першы з іх у 1918 г. быў беларускім вучыцелем; у часе існаваньня Грамады — грамадаўцам, а калі прыйшлі выбары, зьнюхаўся з Умястоўскім за „вознаграждение“ і навет з старастам, які яму сказаў, што дасьць дазвол на трыманьне рэвальвэра, калі будзе агітаваць за „адзінку“. Дык ён і рад старацца! Пачаў баламуціць сялян. Вось „ідэйнасьць“! Але народ далёка ад вас, як і ад вашых „лёзунгаў“! Ен жадае зямлі, культуры і палітычных правоў!

× У Рэвятыцкай вол., Пружанскага пав., „urzędnik“ „надзвычайна поўнамоцны“ „сэквэстратар“, нейкі пан Кашубовіч. Аб яго дзеяльнасьці сьведчаць некалькі фактаў. Так у панядзелак 30-га ліпея гэты сэквэстратар разам з шляхцюком Шчыгдеўскім зайшлі сьпярша ў в. Мар'янава на залеглыя падаткі. Што там пажывіліся, то ня ведама, але... вышлі адтуль хістаючыся, за імі у тым-жа „настрою“ — солтысы. У в. Падасьце зайшлі ў хату Сым. Амелькі, дзе сэквэстратар зажадаў 100 злотых, як штраф за тытун. Калі гаспадар сказаў, што ня мае, аблаяў яго і па-„маскоўску“ і па-„варшаўску“. Урэшце згадзіўся даравацт штраф, калі той паставіць бутэльку! У Нічыпара Амелькі схапіў бяз ведама гаспадара — індыка. Далей у вёсцы наладзіў сапраўдны баль з хабароў.

У выніку ўсяго гэтага ў Падаскага солтыса прапала—50 зл., у Мар'янаўскага—80 зл.

Вось, якіх маем урадоўцаў!

× У Ярэміцкай гм., Стаўпецкага пав., асаднікі гаспадаруюць „па-заходняму“: што наробяць за цэлае лета, дык хапае толькі на якіх пару месяцаў, потым ідуць да Пятра ці Марылі: „Куп, кажуць, у мне дзесенціну, тэраз заплаціш 25 зл., а потым бэндзе дрого“! Прадасьць гэтак, атрымае грошы і... на 45° „тосу“ пускае. Нічога сабе, „па заходняму“!

Рэдактар-Выдавец: Язэп Машчоньскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.